# ЯЎРЭЙСКІ КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ РУХ У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921–1939): ПАМІЖ РЭЛІГІЙНАСЦЮ І СВЕЦКАСЦЮ

*Аляксандр Вабішчэвіч, кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*загадчык кафедры гісторыі культуры і рэлігіі*
*Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А. С. Пушкіна*

*У артыкуле аналізуецца дзейнасць адукацыйных устаноў, культурна-асветніцкіх арганізацый яўрэяў у 20–30-я гг. XX ст. на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Адлюстраваны асноўныя тэндэнцыі, якія адбываліся ў духоўным жыцці яўрэйскай супольнасці: захаванне традыцыйных рэлігійных каштоўнасцей, імкненне да свецкага характару асветы і культуры. Матэрыял артыкула можа быць карысным пры вывучэнні факультатыўных курсаў па гісторыі культуры Беларусі, краязнаўстве, на ўроках гісторыі Беларусі пры паглыбленым вывучэнні тэм «Становішча Заходняй Беларусі. Уз'яднанне беларускага народа» (9 клас), «Заходняя Беларусь пад уладай Польшчы» (11 клас).*

На тэрыторыі Заходняй Беларусі, якая была ўключана ў склад Польшчы паводле Рыжскага мірнага дагавора ад 18 сакавіка 1921 г., пражывалі як беларусы, так і прадстаўнікі іншых этнічных супольнасцей. Даволі адчувальнай у гэтым рэгіёне ранейшай «рысы аседласці» была яўрэйская прысутнасць. Паводле перапісу насельніцтва 1931 г., у Польшчы было 3 млн 113,9 тыс. іудзеяў (9,8 % ад агульнай колькасці жыхароў у краіне), 2 млн 733 тыс. прызналі роднай мовай ідыш ці старажытнаяўрэйскую (іўрыт) (8,6 %) [1, с. 158–159; 2, с. 96–97]. Сучасныя польскія гісторыкі і дэмографы слушна прызнаюць, што дакладная колькасць яўрэяў вагаецца ў межах адзначаных лічбаў. У 1931 г. у Заходняй Беларусі іх налічвалася адпаведна ў межах 342–375 тыс. (8,3–9,2 %). Іх тэрытарыяльнае размяшчэнне выглядала наступным чынам: у васьмі паветах Палескага ваяводства — 9,2–9,6, у пяці Беластоцкага — 13,4–13,5, у Навагрудскім — 7,3–7,8, у васьмі паветах Віленскага ваяводства — 4,1–5,2 (у Вільні — 28,2) [3, с. 42–43; 1, с. 161]. Большая частка яўрэяў жыла ў гарадах і мястэчках. Яны складалі больш за 70 % насельніцтва Бярозы-Картузскай, Кобрына, Слоніма. У Гродна іх было 42,6 %, Пінску — 63,4, Лідзе — 61,7, Навагрудку — 53,5, Брэсце — 44,3 % [4].

Хоць польскія ўлады не змаглі выпрацаваць адзінай палітыкі адносна яўрэяў, аднак польскія палітычныя лагеры выступалі супраць яўрэйскай нацыянальнай аўтаноміі. Польская адміністрацыя абмяжоўвала прыём яўрэяў на працу ў дзяржаўным сектары. Прыкладна з 1923 г. існавала неафіцыйная працэнтная норма ў сярэдніх і вышэйшых навучальных установах. Доля яўрэйскай моладзі сярод студэнтаў на працягу 1920–1930-х гг. змянша-



11

лася. У 1937/1938 акадэмічным годзе вучылася толькі 2,7 % студэнтаў-першакурснікаў, роднай мовай якіх былі ідыш або іўрыт [5], а да канца 1930-х гг. доля яўрэяў-студэнтаў складала каля 10 %. Былі спробы ганебнай дыскрымінацыі ў ВНУ — увядзення для іх «лаўкавага гета» (апошнія рады ў вучэбных аўдыторыях). Нягледзячы на канстытуцыйныя гарантыі і міжнародныя абавязацельствы Польшчы, яўрэі не атрымалі матэрыяльнай падтрымкі для прыватных школ з выкладаннем на ідыш і іўрыце. Такія школы ўтрымліваліся за кошт платы за вучобу, невялікіх субсідый рэлігійных абшчын (кагалаў) і ахвяраванняў яўрэйскага насельніцтва. Істотная дапамога аказвалася яўрэйскай дыяспарай з-за мяжы.

Нават у такіх умовах яўрэйская супольнасць праявіла сваю жыццяздольнасць, актыўна супрацьстаяла асіміляцыі. У духоўным жыцці яўрэйскага грамадства дамінуючыя пазіцыі займалі каштоўнасці іудаізму, што прадвызначалі нацыянальна-рэлігійную накіраванасць установаў адукацыі, культурна-асветніцкіх арганізацый. Адначасова ўзрастала цікаўнасць і да свецкай культуры, адукацыі, навукі, з чым вымушаны былі лічыцца іудзейскія артадоксы. Яўрэйская рэлігійная адукацыя, якая складалася з чатырох тыпаў школ — хедэраў, талмуд-тораў, школ «Бет-Якаў» (на іўрыце — «Дом Якава») для дзяўчат і іешыў (ешыботаў) для хлопцаў, — садзейнічала распаўсюджванню іудаізму сярод яўрэйскага насельніцтва [6, с. 669]. У навучальных планах хедэраў (яўрэйскіх пачатковых рэлігійных школ) былі як рэлігійныя (Біблія, Талмуд і інш.), так і свецкія прадметы (польская мова, гісторыя, прыродазнаўства, геаграфія, матэматыка). У адрозненне ад хедэраў, у талмуд-торах крыху больш увагі надавалі свецкім прадметам. Рэлігійныя дысцыпліны вывучаліся на іўрыце (у хедэрах — на ідыш, роднай мове для большасці мясцовага яўрэйскага насельніцтва). У рэлігійных артадаксальных школах «Бет-Якаў» для дзяўчат раніцай або вечарам выкладаліся толькі рэлігійныя прадметы, а таксама яўрэйскія традыцыі на іўрыце. У 1934/1935 навучальным годзе школы «Бет-Якаў» ахоплівалі 20 тыс. дзяцей па ўсёй Польшчы [6, с. 700]. Асобныя з іх функцыянавалі ў заходнебеларускім краі. Так, у Пінску пры двухкласнай талмудторы ў 1930 г. была адкрыта трохкласная рэлігійная школа «Бет-Якаў» [7].

Ешыботы былі цэнтрамі іудзейскай тэалагічнай думкі, месцамі выхавання духоўнай эліты яўрэяў. Там юнакі, выпускнікі хедэраў і талмуд-тораў, вывучалі толькі рэлігійныя прадметы. Шматлікія іешывы (як і талмуд-торы) падпарадкоўваліся культурна-асветніцкай арганізацыі «Хорэў», створанай кансерватыўнай яўрэйскай партыяй «Агудат Ісраэль» («Саюз Ізраіля»). Артадоксы прызнавалі іўрыт свяшчэннай мовай літургіі, ідыш — мовай паўсядзённых зносін, а польскую — у якасці дзяржаўнай [8]. Узорам для іншых талмудычных школ стаў ешыбот у Валожыне, заснаваны ў 1802 г. Сусветную вядомасць меў ешыбот у Міры. Яны дзейнічалі таксама ў Лідзе, Клецку, Слуцку, Баранавічах, Кобрыне, Брэсце, Пінску, Навагрудку, Гродна, Вільні і Беластоку [1, с. 249].

Лідэры сіяніцкай партыі «Мізрахі» (на іўрыце — Духоўны цэнтр) імкнуліся спалучыць сіяніцкія ідэі з каштоўнасцямі іудаізму, традыцыі яўрэйскай культуры з тагачаснымі дасягненнямі сусветнай цывілізацыі [9]. Нацыянальна-культурнае развіццё павінна было адбывацца пры адраджэнні іўрыту і свецка-рэлігійным характары асветы. Сіяністы прызнавалі іўрыт мовай «новага яўрэйскага чалавека» ў Палесціне. Партыя «Мізрахі» мела ўласную культурна-асветніцкую арганізацыю «Ябнэ», мэтай якой з'яўлялася пашырэнне іўрыту, культуры і асветы сярод яўрэйскага насельніцтва ў рэлігійна-артадаксальным духу [10]. Гэта таварыства стварала навучальныя ўстановы на ўзор «старых хедэраў». З 1928 па 1933 год іх колькасць узрасла з 18 да 81 [11, с. 265].

Уплывовым у гарадах і мястэчках было і створанае сіяністамі ў 1922 г. яўрэйскае культурна-асветніцкае таварыства «Тарбут» («Культура»). Яно мела права заснoўваць і ўтрымліваць дзіцячыя сады, пачатковыя школы, гімназіі, настаўніцкія семінарыі, бібліятэкі [12]. У гэтых установах яўрэйскую моладзь выхоўвалі ў нацыянальна-рэлігійным духу, рыхтавалі да жыцця і працы ў Палесціне. У іх культурна-асветніцкай дзейнасці была найбольш пашыранай палесцінская тэматы-

ка. Так, аддзел Агульнай сіяніісцкай арганізацыі ў Пінску з 1925 г. наладзіў чытанне лекцый «Яўрэі і адраджэнне Палесціны», «Яўрэйская моладзь і аднаўленне Палесціны», «Вёска і горад у Палесціне» і інш. [13]. Лекцыі па гісторыі Палесціны, яе каланізацыі праводзіла Брэсцкае аддзяленне сіяніісцкай арганізацыі [14].

Колькасць школ «Тарбут» паступова павялічвалася — у 1923/1924 навучальным годзе ў Польшчы дзейнічалі 144 пачатковыя школы, у 1924/1925 — 150, у 1925/1926 — 113, у 1929/1930 — 151 [6, с. 666; 11, с. 253]. У 1934/35 навучальным годзе налічвалася 192 пачатковыя школы і 9 гімназій «Тарбут», што ахоплівалі каля 37 тыс. дзяцей [15, с. 169]. Толькі на працягу 1929–1930 гг. у Палескім ваяводстве было адкрыта каля 30 рэгіянальных прадстаўніцтваў гэтай арганізацыі [16]. У Навагрудскім ваяводстве найбольш актыўныя аддзелы «Тарбут» існавалі ў Слоніме, Лідзе, Іўі, Шчучыне, Міры [17]. З усіх яўрэйскіх культурна-асветніцкіх таварыстваў яны былі самымі шматлікімі на тэрыторыі Беластоцкага ваяводства — у красавіку 1939 г. іх налічвалася 36 (2610 чалавек) [18]. Хоць польскія ўлады незычліва ставіліся да «Тарбут», аднак не абвінавачвалі яе ў антыдзяржаўнай дзейнасці, бо былі зацікаўлены ў эміграцыі яўрэяў як сродку вырашэння іх сацыяльных праблем [19, с. 112].

Сіяніісцкім установам даводзілася сапернічаць з культурна-асветніцкімі арганізацыямі, створанымі Бундам і партыяй сацыял-сіяніісцкага напрамку Паалей Цыён. Свецкі яўрэйскі культурна-асветніцкі рух, які падтрымліваў ідыш, прадстаўляла Цэнтральная яўрэйская (ідышысцкая) школьная арганізацыя (ЦЯША), створаная ў 1921 г. Лідэры Бунда паставілі для сябе мэту — стварыць матэрыяльную базу для «яўрэйскай свецкай школы сацыялістычнага тыпу» [20, с. 48]. Быў узяты курс на стварэнне арганізацый, якія былі б пазбаўлены шматлікіх забарон і абмежаванняў традыцыйнага іудаізму, перасталі быць «ідэалагічным гета» [1, с. 241; 21, с. 115]. У 1927/1928 навучальным годзе ЦЯША ўтрымлівала ў Польшчы 95 пачатковых школ, 6 гімназій, 1 настаўніцкую семінарыю, 33 дзіцячыя сады, 65 вячэрніх школ, што ахоплівалі каля 13,5 тыс. чалавек [22, с. 107; 23, с. 296]. Пераважная большасць гэтых устаноў размяшчалася ў Заходняй Беларусі. Негатыўныя вынікі сусветнага эканамічнага крызісу, што прывялі да збяднення яўрэйскіх працоўных, дзеці якіх складалі большасць вучнёўскага кантынгенту, жорсткая нацыянальная палітыка польскага ўрада, узмацненне фашызацыі ў грамадска-палітычным жыцці Польшчы ў першай палове 1930-х гг., заняпад дзейнасці Бунда, канкурэнцыя з боку «Тарбут» абумовілі аслабленне пазіцый ЦЯША. Толькі ў пачатку 1935 г. назіралася некаторае ажыўленне яе дзейнасці, выкліканае агульным уздымам рабочага руху ў Польшчы. Агульная колькасць дзяцей у школах ЦЯША складала тады 10 тыс. (па іншых ацэнках — 15,5 тыс.) [1, с. 246; 15, с. 167].

Бунд і Паалей Цыён аказвалі ўплыў і на створанае ў 1921 г. Аб'яднанне яўрэйскіх школ (АЯШ), лідэры якога выступалі за новую школу (свабодную ад нацыяналістычнага і рэлігійнага ўплыву) з выкладаннем на ідыш. На працягу 1920-х гг. яе аддзелы ўзніклі ў многіх заходнебеларускіх гарадах і мястэчках. Так, у Палескім ваяводстве ў 1924 г. іх было 9 (каля 800 чалавек) [24]. Яшчэ адна культурна-асветніцкая арганізацыя ідышысцкага напрамку — «Культур-Ліга» — да канца 1920-х гг. стварыла сетку сваіх структурных адзінак па ўсёй Заходняй Беларусі. У Палескім ваяводстве налічвалася каля 30 аддзелаў «Культур-Лігі» — у Брэсце, Пінску, Кобрыне, Пружанах, Дамачаве, Бярозе, Століне і Давыд-Гарадку [25]. Бунд стварыў таксама рабочыя кааператывы, якія мелі свае клубы, бібліятэкі, народныя універсітэты. Сродкі ад правядзення платных культурна-масавых мерапрыемстваў (лекцый, вечароў, тэатральных і музычных прадстаўленняў) былі адной з крыніц папаўнення партыйнай казны бундаўскіх арганізацый.

Традыцыйная яўрэйская сям'я, кагал не змаглі спаўна задаволіць усіх зацікаўленняў моладзі. Гэта з'яўлялася адной з прычын прытоку ў 1930-я гг. маладых яўрэяў у палітычныя партыі, грамадскія арганізацыі [26, с. 77, 92]. Бундаўская маладзёжная арганізацыя «Цукунфт» («Будучыня») стала масавай, у асобных гарадах і мястэчках пад яе ўплывам знаходзілася практычна ўся яўрэйская мо-

ладзь [27]. Аддзелы «Цукунфта» мелі вячэрнія школы для рабочай моладзі, драматычныя гурткі, харавыя калектывы і аркестры.

Частка яўрэйскай інтэлігенцыі была не задаволена як выключнай прыхільнасцю да іўрыту з боку сіяніцкіх арганізацыяй, так і абсалютызацыяй ідыш, сацыялістычнымі поглядамі бундаўцаў. Таму ў 1928 г. было ўтворана таварыства «Шул-Культ» (скарочана ад назвы на ідыш «Школьны і культурны саюз»), якое адкрывала школы з вывучэннем і ідыш, і іўрыта [21, с. 135]. У адрозненне ад школ ЦЯША, тут асноўную ўвагу надавалі вывучэнню іудаікі. Аднак таварыства «Шул-Культ» не здолела разгарнуць шырокай сеткі ўстаноў адукацыі з-за супрацьдзеяння польскіх улад.

Вялікі ўплыў на культурна-асветніцкае жыццё ў заходнебеларускіх землях аказвалі ўстановы Вільні. У міжваеннае дваццаціўгоддзе ў «літоўскім Іерусаліме» («Іерусаліме дыяспары») (як ахрысцілі Вільню яшчэ з новага часу) склаўся міжнародны цэнтр яўрэйскага культурнага і літаратурнага жыцця на мове ідыш [28]. У горадзе дзейнічала больш за 100 розных яўрэйскіх грамадскіх арганізацый, таварystваў: Яўрэйскі навуковы інстытут, яўрэйскае гісторыка-этнаграфічнае таварыства, музей, таварыства падтрымкі яўрэйскага мастацтва і інш. Там жа знаходзілася сядзіба Цэнтральнага камітэта па адукацыі, састаўной часткі ЦЯША, у пачатковых школах якой у 1938 г. было 1283 вучні, а ва ўсіх яе навучальных установах — 2183 чалавекі [29].

Культурна-асветніцкі рух паспрыяў этнічнаму самазахаванню яўрэяў заходнебеларускіх земель ва ўмовах мэтанакіраванай асіміляцыі з боку Польшчы. Сярод іншых этнічных супольнасцей яны вылучаліся складанай структурай і рознай ідэалагічнай накіраванасцю сваіх арганізацый і ўстаноў. Каштоўнасці іудаізму паранейшаму займалі вызначальнае месца ў іх грамадскім і сямейным жыцці, аб чым сведчыла наяўнасць разгалінаванай сеткі рэлігійных школ. Хоць спробы развіцця свецкай адукацыі і культуры не рэалізаваліся спаўна, аднак яны мелі наватарскі характар, уплывалі на розныя бакі побыту яўрэяў, набылі гучны міжнародны рэзананс. Аднак пры гэтым асіміляцыйныя працэсы ў асяроддзі яўрэяў былі слабымі. Саперніцтва культурна-асветніцкіх арганізацый адбывалася не столькі з-за моўнага пытання (падтрымка ідыш або іўрыта), колькі з-за прыхільнасці да адной ці другой канцэпцый яўрэйскай будучыні, прадстаўленых сіяніцкімі і сацыялістычнымі партыямі. Нягледзячы на разыходжанні, ніводная з іх не выступала з пазіцыі нацыянальна-культурнага нігілізму.


1. Najnowsze dzieje żydów w Polsce: w zarysie (do 1950 roku). — Warszawa, 1993.
2. *Tomaszewski, J.* Ojczyzna nie tylko Polaków: Mniejszości narodowe w Polsce w latach 1918–1939 / J. Tomaszewski. — Warszawa, 1985.
3. *Mironowicz, E.* Zmiana struktury narodowościowej na pograniczu polsko-białoruskim w XX wieku / E. Mironowicz, S. Tokć, R. Radzik. — Białystok, 2005.
4. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (далей — ДАБВ). — Фонд 1. — Воп. 1. — Спр. 2528. — Арк. 39; Спр. 2516. — Арк. 1.
5. Oświata i wychowanie. — 1938. — Zeszyt 6. — S. 557–563.
6. Sprawy narodowościowe. — 1937. — № 6.
7. ДАБВ. — Фонд 59. — Воп. 2. — Спр. 703. — Арк. 3.
8. ДАБВ. — Фонд 93. — Воп. 1. — Спр. 315. — Арк. 2.
9. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (далей — ДАГВ). — Фонд 662. — Воп. 3. — Спр. 1. — Арк. 162.
10. ДАГВ. — Фонд 88. — Воп. 1. — Спр. 22. — Арк. 150.
11. Sprawy narodowościowe. — 1935. — № 3/4.
12. ДАГВ. — Фонд 88. — Воп. 1. — Спр. 22. — Арк. 9; Фонд 662. — Воп. 3. — Спр. 4. — Арк. 85.
13. ДАБВ. — Фонд 1. — Воп. 9. — Спр. 112. — Арк. 25.
14. ДАБВ. — Фонд 2. — Воп. 1. — Спр. 385. — Арк. 34, 67, 141, 150, 156.
15. *Mauersberg, S.* Szkolnictwo powszechne dla mniejszości narodowych w Polsce w latach 1918–1939 / S. Mauersberg. — Wrocław—Warsawa—Kraków, 1968.
16. ДАБВ. — Фонд 1. — Воп. 9. — Спр. 879. — Арк. 5.

17. ДАГВ. — Фонд 662. — Воп. 3. — Спр. 4. — Арк. 85.
18. Archiwum Państwowe w Białymstoku. — Zespół 47. — Sygnatura 121. — S. 49.
19. *Tomaszewski, J.* Rząd Rzeczypospolitej Polskiej wobec emigracji Żydów / J. Tomaszewski // Biuletyn Żydowskiego Instytutu Historycznego — Instytutu Naukowo-Badawczego. — 1994. — № 4; 1995. — № 2 (172–174). — S. 99–112.
20. *Korsch, R.* Żydowskie ugrupowania wywrotowe w Polsce / R. Korsch. — Warszawa, 1925.
21. *Żebrowski, R.* Dzieje zydów w Polsce: wybór tekstów źródłowych 1918–1939 / R. Żebrowski. — Warszawa, 1993.
22. Sprawy narodowościowe. — 1927. — № 2.
23. Sprawy narodowościowe. — 1929. — № 2.
24. ДАБВ. — Фонд 1. — Воп. 9. — Спр. 1183. — Арк. 23.
25. ДАБВ. — Фонд 1. — Воп. 10. — Спр. 139. — Арк. 16.
26. *Mendelsohn, E.* Żydzi Europy Środkowo-Wschodniej w okresie międzywojennym / E. Mendelsohn. — Warszawa, 1992.
27. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. — Фонд 242-п. — Воп. 1. — Спр. 61. — Арк. 15; Спр. 657. — Арк. 293.
28. Wilno i Ziemia Wileńska: zarys monograficzny. — Wilno, 1930. — T. 1.; *Аграновский, Г.* Литовский Иерусалим: краткий путеводитель по памятным местам еврейской истории и культуры в Вильнюсе / Г. Аграновский, И. Гузенберг. — Вильнюс, 1992; *Іофэ, Э.* Роля Вільні ў культурным жыцці беларускіх яўрэяў (XVIII — першая палова XX ст.) / Э. Іофэ // Весці Міжнароднай акадэміі вывучэння нацыянальных меншасцей. — Брэст, 1997. — С. 32–35; *Mejeris, Š.* Vilniaus žydu cultūra tarp dviejų pasaulinių Karų // Vilniaus cultūrinis gyvenimas (1900–1940) / Š. Mejeris. — Vilnius, 1998. — S. 137–140; *Minczeles, H.* Vilna, Wilno, Vilnius: La Jerusalem de Lituanie / H. Minczeles. — Paris, 2000; *Wołconowski, J.* Stosunki polsko-żydowskie w Wilnie i na Wileńszczyźnie 1919–1939 / J. Wołconowski. — Białystok, 2004.
29. Цэнтральны дзяржаўны архіў Літвы (Lietuvos Centrinis Valstybinis Archyvas). — Фонд 53. — Воп. 23. — Спр. 1764. — Арк. 8.


## Кантрольныя пытанні

1. Якой была палітыка польскіх улад адносна яўрэйскага насельніцтва?
2. Назавіце асноўныя тыпы яўрэйскіх рэлігійных школ, вызначце іх асаблівасці.
3. Выдзеліце яўрэйскія культурна-асветніцкія арганізацыі сіяніцкага і сацыялістычнага напрамкаў, прааналізуйце іх мэты і вынікі дзейнасці.

**Мудрость тысячелетий. — М., 2002.**

*Смерть — последний аргумент.*

*Сначала жить, а уж затем философствовать.*

*Сознание хорошо прожитой жизни и воспоминания о множестве добрых дел приятны.*

*Солнце светит для всех.*

*Старики — дважды дети.*